ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

ВЕРАСЕНЬ – КАСТРЫЧНІК

Віцебск 2016

ДУ “ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА”
Аддзел бібліятэказнаўства

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Верасень–кастрычнік

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2016

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнік *А. М. Васілеўская*
Рэдактар *Н. А. Пугачова*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : верасень–кастрычнік : інфармацыйнае паведамленне / ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”, Аддзел бібліятэказнаўства ; [склад. А. М. Васілеўская]. – Віцебск, 2016. – 31 с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”, 2016

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Верасень–кастрычнік

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнік **Васілеўская** Алена Мікалаеўна
Адказны за выпуск Т. М. Адамян
Камп’ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”
210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: metodic@vlib.by, vlib@vlib.by

фестывалі тэатраў лялек “Пятроўскі балаган 2016” у Калінінградзе (Расійская Федэрацыя). Першая самастойная работа рэжысёра Міхаіла Клімчука не толькі спадабалася гледачам, але і была адмыслова адзначана арганізатарамі фестывалю.

Лепшым спектаклям II Міжнароднага фестывалю тэатраў лялек “Шомбай-fest” (Казань, Расійская Федэрацыя), журы палічыла пастаноўку тэатра “Загубленая душа, або Пакаранне грэшніка”.

http://lialka.by/bel/news/#news-266

ПРАДМОВА

“Культурнае жыццё Віцебскай вобласці” – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка “Хроніка падзей” уключае тэкставыя вытрымкі і аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную на аснове публікацый з гарадскіх, раённых газет Віцебскай вобласці і іх электронных версій за перыяд з 1 верасня па 31 кастрычніка 2016 года. “Хроніка падзей” таксама ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім АМЦНТ, Аршанскай, Браслаўскай, Верхнядзвінскай, Віцебскай, Гарадоцкай, Докшыцкай, Дубровенскай, Лепельскай, Лёзненскай, Полацкай, Ушацкай, Чашніцкай, Шаркаўшчынскай, Шумілінскай раённымі сеткамі бібліятэк, Віцебскай і Наваполацкай гарадскімі сеткамі бібліятэк.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

2 верасня ў Наваполацку адбыўся рок-канцэрт беларускіх груп у падтрымку лозунга “Беларусь без наркотыкаў”. На сцэну выйшлі паўтара дзясятка калектываў з усёй Беларусі.

23 верасня г. Полацк сустракаў удзельнікаў X юбілейнага велапрабегу “Моладзь Расіі і Беларусі – дарога ў будучыню Саюзнай дзяржавы”. Прабег праходзіў па тэрыторыі Смаленскай, Бранскай, Магілёўскай і Віцебскай абласцей.

Полацкі веснік. – 2016. – 23 верас. – С. 2.

Выхаванцы віцебскіх школ мастацтваў **24–25 верасня** выступілі з дабрачыннымі канцэртамі ў залах Мірскага і Нясвіжскага замкаў. Класічны рэпертуар прадставілі для публікі навучэнцы і калектывы ДМШ № 1 і ДШМ № 4.

У рамках дзейнасці Кангрэса ініцыятыў Усходняй Еўропы **30 верасня** ў г. Любліне (Польшча) падведзены вынікі Міжнароднага конкурсу на лепшы праект трансгранічнага супрацоўніцтва. У намінацыі “Турызм” лепшым прызнаны праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі “Музейныя вароты”, у рамках якога забяспечана далейшае ўдасканаленне музейнай інфраструктуры г. Полацка і развіццё маркетынгавых накірункаў у дзейнасці музеяў. Полацкі райвыканкам стаў адзіным з краіны, атрымаўшым узнагароду пераможцы.

Полацкі веснік. – 2016. – 7 кастр. – С. 2.

12 кастрычніка адбылося пашыранае пасяджэнне калегіі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама. Удзел у рабоце калегіі прыняў намеснік міністра культуры Беларусі *Васілій Чэрнік*. Былі разгледжаны наступныя пытанні: “Падвядзенне вынікаў выбарчай кампаніі па выбарах дэпутатаў

КІНАМАСТАЦТВА

Фестываль кароткаметражных фільмаў Cinema Perpetuum Mobile 2016 (некамерцыйнае культурнае мерапрыемства, якое мае на мэце прасоўванне незалежнага аўтарскага кінематографа; пошук новых формаў і рашэнняў у кінамастацтве, развіццё культурнай разнастайнасці ў кіно і ўмацаванне сувязяў паміж кінематаграфістамі і кінематаграфічнымі супольнасцямі па ўсім свеце) адбыўся ў Віцебску ў фармаце: 4 дні – 4 пляцоўкі. Цягам 4-х дзён з **6** па **9 кастрычніка** на розных пляцоўках адбывалася трансляцыя розных праграм фестывалю.

http://news.vitebsk.cc/2016/10/06/cinema-perpetuum-mobile-2016-u-vi

З **25** па **26 кастрычніка** ў віцебскіх кінатэатрах дэманстраваліся кінафільмы Віктара Турава. Рэтраспектыўны паказ прымеркаваны да 80-годдзя кінарэжысёра, народнага артыста СССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР.

http://www.gorod212.by/news/1415187

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

Новы, 91-ы тэатральны сезон, Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа адкрыў **16 верасня** спектаклем “Несцерка” па камедыі В. Вольскага.

http://kolastheatre.by/ru/news/otkrytie-91-go-sezona-i-press-konferenciya

Новы сезон у Беларускім тэатры “Лялька” распачаўся **18 верасня** пастаноўкай рэжысёра *В. Клімчука* “Папялушка, або Крышталёвыя чаравічкі”.

http://www.lialka.by/bel/

Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь ТВУ “Беларускі тэатр “Лялька” сумесна з ГА “Саюз беларускіх пісьменнікаў” абвясціў конкурс водгукаў на спектакль “Скарб” паводле казкі У. Караткевіча “Чортаў скарб”.

http://www.lialka.by/bel/

Спектакль “Горад клоўна Піка” прыняў удзел у V Міжнародным

ВАМЦНТ

З **20 кастрычніка** па **8 лістапада** ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці працавала **абласная выстава-конкурс народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Ад майстра да вучня”**. У экспазіцыі былі прадстаўлены калекцыі работ удзельнікаў – майстроў і іх вучняў па саломапляценні, ганчарстве, кераміцы, разьбе па дрэве, маляванцы і інш. Майстры разам са сваімі вучнямі праводзілі майстар-класы, дзе прадстаўлялі аўтарскія методыкі перадачы свайго рамяства для ўсіх жадаючых. Работу майстроў і іх вучняў ацэньвала абласное журы.

Гран-пры атрымала *Тэрэса Альфонсаўна Худзякова* (саломапляценне) з Чашніцкага Дома рамёстваў.

Пераможцамі абласнога праекта ў розных намінацыях сталі:

– у намінацыі “За слынную і плённую працу па вывучэнні традыцыйных рамёстваў” *Іван Мікалаевіч Будзіч* (разьба па дрэве) з Лепельскай ДШМ;

– у намінацыі “Аднаўленне і засваенне лакальных асаблівасцей традыцыйнай рамеснай тэхналогіі” *Ганна Рымдзёнак* (ткацтва) з вучаніцай *Ганнай Высоцкай* з Германавіцкага Дома ганчара Шаркаўшчынскага раёна;

– у намінацыі “Вывучэнне і папулярызацыя лакальных асаблівасцей традыцыйнай рамёснай тэхналогіі” *Таццяна Карнеева*, майстар Глыбоцкага Дома рамёстваў;

– у намінацыі “Лепшы майстар-клас” пераможцам стаў *Сяргей Рымдзёнак* (кераміка) з вучням *Дзмітрыем Смолікавым* з Германавіцкага Дома ганчара Шаркаўшчынскага раёна.

ВАМЦНТ

Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу шостага склікання” і “Пра стан ідэалагічнай работы ў працоўных калектывах арганізацый вобласці і па месцы жыхарства”. У рамках калегіі адбылося ўшанаванне лепшых работнікаў культуры Віцебшчыны. Ганаровая грамата Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь была ўручана дырэктару ВАМЦНТ *Кацярыне Лабука*, нагрудны знак Міністэрства культуры Беларусі – першаму намесніку генеральнага дырэктара ЦК “Віцебск” *Алене Серабраковай*. Лепшым прадстаўнікам устаноў культуры Віцебшчыны ўручаны прэміі Віцебскага аблвыканкама за высокія творчыя дасягненні ў сферы культуры і мастацтва, устаноўленыя ў васьмі намінацыях. Лепшай артысткай філармоніі прызнана *Таццяна Моўля*, а лепшым артыстам тэатра – *Сяргей Толкач* з Беларускага тэатра “Лялька”. Узнагароды таксама ўдастоены завуч Дзіцячай мастацкай школы Віцебска *Вольга Валюшкіна* (“За педагагічныя дасягненні”), навуковы супрацоўнік Музея гісторыі і культуры Наваполацка *Марыя Куксёнак-Сімановіч* (“Лепшы музейны работнік”), метадыст Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна *Уладзімір Шакуцеў* і кіраўнік народнай эстраднай студыі “Калейдаскоп” філіяла № 1 “Докшыцкі гарадскі цэнтр культуры” Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці гэтага раёна *Андрэй Чабан* (“Лепшы клубны работнік”). “Лепшым майстарам традыцыйных рамёстваў” стаў дырэктар Дома рамёстваў Ушацкага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці *Міхаіл Багдановіч* і майстар філіяла № 2 “Докшыцкі раённы дом рамёстваў” Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці гэтага раёна *Таццяна Гаварцова*. Лепшым бібліятэчным работнікам прызнана загадчык філіяла № 2 Падсвільскай дзіцячай бібліятэкі Глыбоцкай ЦБС *Аксана Каляга*, а лепшым арганізатарам платных паслуг насельніцтву – дырэктар Міёрскай цэнтралізаванай клубнай сістэмы *Мечыслаў Фурс*.

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

Гарадоцкія народныя майстры і артысты прадставілі Віцебскую вобласць у якасці аднаго з рэгіёнаў-партнёраў Лодзінскага ваяводства, прыняўшы ўдзел у традыцыйным маштабным міжнародным мерапрыемстве, рэгіянальным Лодзінскім "міксеры", які адбыўся **4 верасня**. Вакальны ансамбль "Отрада" Гарадоцкага цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці выступіў у Культурным Цэнтры моладзі г. Лодзь (Польшча). Выступленне гэтага ж калектыву, а таксама выстаўка вырабаў народных майстроў Гарадоччыны, прэзентаваная народнымі майстрамі Дома рамёстваў і фальклору *Марынай Гушча* і *Васіліем Сіманковічам*, прайшлі ў мястэчку Ксаверув.

Гарадоцкі веснік. – 2016. – 10 верас. – С. 5.

Бестэрміновы дагавор аб дружбе, дабрасуседстве і супрацоўніцтве ў мясцовым самакіраванні, сацыяльна-эканамічнай сферы заключаны ў **верасні** паміж Лёзненскім раёнам і Ельнінскім раёнам Смаленскай вобласці. У Ельні лёзненская дэлегацыя прыняла ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных 73-годдзю вызвалення Смаленшчыны ад фашысцкай акупацыі. Пасля падпісання дагавора на гарадской плошчы адбыўся канцэрт артыстаў мастацкай самадзейнасці Дома культуры аграгарадка Дабрамыслі.

Витебские вести. – 2016. – 29 сент. – С. 2.

Гарады Белаярскі (Расійская Федэрацыя) і Віцебск сталі пабрацімамі, пагадненне аб гэтым было падпісана ў **верасні** ў час візіту ў горад віцебскай дэлегацыі.

http://www.soyuz.by/news/region/29041.html#

Артысты віцебскай фальк-групы "Вытокі" (студыя "Гулівер і ліліпуты" пад кіраўніцтвам *Алены Капскай*) прадставілі Беларусь на фестывалі консульстваў, якія размешчаны ў французскім рэгіёне Овернь–Рона-Альпы.

Витебские вести. – 2016. – 15 сент. – С. 2.

Дні еўрапейскай спадчыны-2016 прайшлі пад дэвізам

самога мастака і яшчэ 50 – з фондаў музея, аб'яднаных пад назвай "Прастора пачуццяў і сэнсаў".

http://zviazda.by/be/news/20160914/1473841351-alyaksandr-salauyou-adzna-

У Мастацкай галерэі Полацка ў **верасні** ў рамках праекта "Адзіная культурная прастора" з Наўгародскім аб'яднаным музеем-запаведнікам працавала выстаўка "Лики власти" (рэтраспектыўная серыя партрэтаў дынастыі Раманавых і гістарычныя карціны рускага жывапісца М.М. Ге).

Полацкі веснік. – 2016. – 23 верас. – С. 24.

У **кастрычніку** ў Віцебскім мастацкім музеі адбылося адкрыццё выстаўкі "Феерыя колераў: ад эцюдаў да кампазіцыі дывана" Яе аўтарамі стала творчая пара: дацэнт, мастацтвазнаўца, лаўрэат звання "Чалавек года Віцебшчыны-2016" *Міхаіл Цыбульскі* і яго жонка, мастак-канструктар ААТ "Віцебскія дываны", лаўрэат звання "Лепшы дызайнер Віцебскай вобласці-2010" *Людміла Цыбульская*.

У арт-прасторы на Талстога, 7 **у кастрычніку** адкрылася абноўленая выстаўка работ *Валянціны Ляховіч* "Преобразование-стагнация и Я", а таксама выстаўка шведскай мастачкі *Людмілы Хрысцесевай* "Sustainidentity".

У **кастрычніку** ў Віцебскім мастацкім музеі адбылося адкрыццё дзвюх выставак: мастака *Алега Кастагрыза* – "Искусственное дыхание" і пастэльнай графікі *Кацярыны Мясніковай* – "Цішыня. Postscriptum".

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

21 верасня ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці адбыўся паэтычны вечар *Ірыны Малашэнкі* і прэзентацыя зборніка яе вершаў "Я вновь пишу в порыве вдохновенья".

ВАМЦНТ

Выстаўка-продаж упрыгожванняў і аксесуараў "З малахітавай шкатулкі" рамеснікаў Віцебшчыны экспаніравалася ў абласным метадычным цэнтры народнай творчасці да **10 кастрычніка**.

гістарычнага музея (Літва). У экспазіцыі было прадстаўлена больш за 120 ордэнаў і медалёў розных краін свету, якія адлюстроўваюць традыцыі стварэння сімвалаў за заслугі перад Айчынай і народам. У **кастрычніку** ў музеі адкрылася яшчэ адна выстаўка – выстаўка графікі эстонскіх мастакоў “MINIPRINT”.

Віцьбічы=Витьбичи. – 2016. – 15 окт. – С. 8.

18 кастрычніка ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адбылося адкрыццё гістарычнай выставы “Як Фенікс з попелу. Разбурэнне і аднаўленне Варшавы 1939–1955”. Праект прысвечаны 71-й гадавіне заканчэння Другой сусветнай вайны, 71-й гадавіне вызвалення Варшавы і 35-годдзю ўнясення рэканструкцыі “Старога горада” Варшавы ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Выстава арганізавана сумесна з Домам сустрэч з гісторыяй (Варшава) і Польскім Інстытутам у Мінску.

http://ratusha-vit.by/content/vystavka-yak-feniks-z-popelu

23 кастрычніка на плошчы Перамогі ў Віцебску зрабіў прыпынак музей-бус з мабільнай экспазіцыяй “Вызваленне Беларусі. Верасень 1943 г. – ліпень 1944 г.” праекта Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

http://www.gorod212.by/news/1414775

МАСТАЦТВА

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

31 жніўня ў Віцебскім мастацкім музеі адкрылася выстаўка вядомага акварэліста *Ф. Гумена* “Акварели текущего года”.

У Віцебскім мастацкім музеі ў **верасні** экспаніравалася выстаўка “Венценосная Семья. Путь Любви”, прысвечаная апошняму цару Расійскай імперыі Мікалаю II.

Патрыярх віцебскага авангарда *Аляксандр Салаўёў* напярэдадні 90-годдзя **13 верасня** сабраў прыхільнікаў сваёй творчасці ў Віцебскім мастацкім музеі. У экспазіцыі былі прадстаўлены 63 карціны з калекцыі

распаўсюджвання ведаў пра культуру і гісторыю. Міністэрства культуры Беларусі ў рамках граніцы выдзяліла больш вузкую тэму – “Спадчына і веды”. Кульмінацыяй Дзён у Віцебску **23 верасня** стаў запуск трамваяў і тралейбуса, на якія былі нанесены эскізы членаў УНОВИСА.

Витебские вести. – 2016. – 27 сент. – С. 8.

У **верасні** дэлегацыя Віцебска прыняла ўдзел у святочных мерапрыемствах, прысвечаных 25-годдзю партнёрскіх пагадненняў паміж Нінбургам (Германія) і Віцебскам. У склад дэлегацыі ўвайшлі і ўдзельнікі фальклорнага ансамбля “Перапёлачка” гімназіі № 3 імя А.С. Пушкіна.

Витебские вести. – 2016. – 15 сент. – С. 3.

Браслаўскі раён заключыў пагадненне аб партнёрскім супрацоўніцтве з Аўгустоўскім паветам Польшчы. Пагадненне прадугледжвае развіццё двухбаковых адносін, знаёмства з гаспадарчай і сацыяльнай дзейнасцю рэгіёнаў і іх жыхароў.

http://vitvesti.by/politics/braslavskii-raio-s-avgustovskim-povetom.html

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

КЛУБНАЯ СПРАВА

Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь тэатр танца “Прэм’ер-спонайд” Палаца культуры культурна-спартыўнага комплексу ААТ “Полацк-Шкловалакно” ў жніўні прымаў удзел у міжнародным конкурсе танца ў Германіі.

Полацкі веснік. – 2016. – 26 жн. – С. 6.

З **1** па **3 верасня** ў Полацку прайшоў II Нацыянальны дзіцяча-маладзёжны форум “Скарынаўскія дні ў Полацку-2016”. У рамках форуму быў рэалізаваны праект “Нашчадкі Скарыны”, працавалі творчыя пляцоўкі, праводзіліся “Скарынаўскія гульні”, адбыўся краязнаўчы квест “Вароты гісторыі” і інш.

Полацкі веснік. – 2016. – 26 жн. – С. 1.

3 верасня аграгарадок Мазалава прыняў шматлікіх гасцей у межах раённага свята гульняў “Мазалаўскі карагод гульняў і гульбішчаў”. Да свята была прымеркавана прэзентацыя новага праекта “Пашырэнне эканамічных магчымасцей у сельскай Беларусі” і ініцыятывы “Утварэнне і адраджэнне гісторыка-эканамічнай спадчыны для ўстойлівага развіцця Мазалаўскага і Бабініцкага сельсаветаў”. У час свята прайшоў раённы конкурс маладых сем’яў “Уладар сяла-2016”.

Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2016. – 10 верас. – С. 5.

11 верасня ў аграгарадку Дворышча Расонскага раёна адбылося свята, прысчвечанае роднай зямлі. У час святочных мерапрыемстваў прайшоў канцэрт, падрыхтаваны ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці Дварышчанскага сельскага Дома культуры, у ім прынялі ўдзел і госці – народны калектыў “Крыніца” Янкавіцкага СДК.

Голас Расоншчыны. – 2016. – 17 верас. – С. 3.

95-гадовы юбілей адзначыў у гэтым годзе народны тэатр, што працуе пры Талачынскім раённым цэнтры культуры і народнай творчасці (кіраўнік *С. Васільева*).

Витебские вести. – 2016. – 17 сент. – С. 5–6.

У **верасні** ў Казянскім СДК Браслаўскага раёна адбылося свята Дуба. У час мерапрыемства ўшаноўвалі сёлетніх юбіляраў, старэйшых жыхароў вёскі, адбылося выступленне вакальнай групы “Браслаўскія весялухі”.

Браслаўская звязда. – 2016. – 1 кастр. – С. 6.

У канцы **верасня** браслаўскія артысты народнага ансамбля песні “На панадворку” РЦК прадставілі Віцебшчыну на восеньскім сельскагаспадарчым кірмашы выхаднога дня ў Мінску.

Браслаўская звязда. – 2016. – 5 кастр. – С. 6.

У **верасні** свята вёскі Хайсы адзначылі жыхары Віцебскага раёна. Перад гледачамі выступіў ансамбль песні “Крыніцы” жаночага клуба “Залаты ўзрост” Мазалаўскага сельскага Дома культуры.

Жыццё Прыдзвіння (Віцебск). – 2016. – 17 верас. – С. 3.

годдзю з дня нараджэння паэта (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

7 кастрычніка споўнілася 5 гадоў клубу па інтарэсах “Натхненне” (*Васюкоўская сельская бібліятэка*).

ДУК “Шумілінская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

4 верасня Літаратурна-музычная гасцёўня “Ён душой пакутаваў за лёс беларускага слова”, прысвечаная памяці *А. Салтука* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

15 верасня ў рамках Дня бібліятэк Беларусі наведвальнікам былі прадстаўлены інсталяцыя “Усе сляды вядуць у бібліятэку”, выставы “Бібліятэка пачынаецца з выставы”, “Літаратурная лаўка”, “Са стагоддзя XX у стагоддзе XXI” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

15 верасня Вечар-партрэт ветэрана педагагічнай працы *Кацярыны Фамінічны Палоўнікавай* “Мае гады – маё багацце” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

МУЗЕЙНАЯ СПРАВА І АХОВА ПОМНІКАЎ

Віцебскі музей гісторыі прыватнага калекцыяніравання памяняў прапіску і адкрыў свае дзверы ў будынку першай гарадской электрастанцыі **6 верасня**.

http://news.vitebsk.cc/2016/09/05/vitebskiy-muzey-istorii-chastnogo

23 верасня ў Арт-цэнтры Марка Шагала адбылося ўрачыстае мерапрыемства “Дзень нараджэння Музея Марка Шагала”, прысвечанае 25-годдзю стварэння музея.

http://ont.by/news/our_news/myzeyu-shagala-v-vitebske-25-let.-yubile

З **30 верасня** па **2 кастрычніка** ў Магілёве праходзіў III Нацыянальны форум “Музеі Беларусі”. Музей Марка Шагала ў Віцебску ўзнагароджаны дыпломам I ступені ў намінацыі “За лепшае музейнае выданне” за каталог калекцыі “Марк Шагал. Эстампы: 1922–1985”.

З **4** па **28 кастрычніка** ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі працавала выстаўка “Узнагароды краін свету” з фондаў Тракайскага

25 кастрычніка “Вечер кошмариков в библиотеке, или Праздник избавления от страха” для чытачоў сярэдняга школьнага ўзросту (*дзіцячая бібліятэка імя У. Дубоўкі*).

ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Расонскага раёна”

15 верасня Святочная праграма да Дня бібліятэк Беларусі і 90-годдзя цэнтральнай раённай бібліятэкі “Приглашаем всех друзей – у библиотеки юбилей” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Ушацкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

22 верасня *Ушацкая цэнтральная раённая бібіліятэка* адзначыла 90-годдзе.

Витебские вести. – 2016. – 29 сент. – С. 2.

У **кастрычніку** ў *Вяркудскай сельскай бібліятэцы* адбыўся святочны вечар “Как молоды мы были”, у *Вялікадолецкай сельскай бібліятэцы* прайшла гадзіна мастацтва “Магнетизм Пабло Пикассо”.

ДУК “Чашніцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

Да Дня пажылога чалавека ў *Іванскай сельскай бібліятэцы* прайшоў святочны вечар “Калі дрэвы былі маладымі...”. У мерапрыемстве прынялі ўдзел вакальная група “Верасень” раённага Савета ветэранаў і паэтка *Валянціна Гарбачова*.

ДУК “Шаркаўшчынская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

16 верасня Творчая сустрэча “Упаў радок на белы ліст паперы” з членамі народнага літаратурна-музычнага аб'яднання “Світанак” *Кацярынай Сосна, Міледзіем Кукуцем, Віктарам Лагуном, Людмілай Ардынскай, Надзеяй Вайцюль, Ірынай Тарбецкай, Аленай Гугалінскай* (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

6 кастрычніка Конкурс чытальнікаў вершаў сярод сельскіх бібліятэкараў “Чытаем Максіма Багдановіча разам”, прысвечаны 125-

З **30 верасня** па **1 кастрычніка** ў г. Віцебску праходзіла IX спецыялізаваная выстава-кірмаш “Віцебшчына – за здаровы лад жыцця-2016”. У адкрыцці і закрыцці выставы-кірмашу прыняў удзел харэаграфічны калектыў “ОльКира” Альгоўскага СДК Віцебскага раёна. У канцэрце-прэзентацыі прадпрыемстваў выставы ўдзельнічалі выканаўцы *Сяргей Гаварцоў, Наталля Малевіч* з Віцебскага РДК, а таксама вядучыя спецыялісты Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці.

ВАМЦНТ

1–2 кастрычніка ў Мінску прайшоў V фестываль песні Ганны Герман “Эўрыдыка”, арганізаваны Пасольствам Рэспублікі Польшча і дуэтам “VitaM” *Марынай Таварніцкай* і *Віталем Аляшкевічам*. У ім прыняла ўдзел настаўніца Славенскай сярэдняй школы Талачынскага раёна *Галіна Васільеўна Шнырко* і атрымала прыз ў намінацыі “За шчарасць выканання”.

http://www.natal.by/2016/10/10/%D1%82%D0%BE%D0%BB%D0%

8 кастрычніка ў аграгарадку Зялёнка Полацкага раёна адбылося народнае восеньскае свята “Кузьмінкі”.

Полацкі веснік. – 2016. – 7 кастр. – С. 2.

13 кастрычніка ў Віцебскай абласной філармоніі прайшоў святочны канцэрт “Табе, родная, нашы песні”, прысвечаны Дню маці. Руская, беларуская і класічная музыка, а таксама харэаграфічныя кампазіцыі былі выкананы ў двух аддзяленнях. У першым выступілі салісты *Алена Гракава, Сяргей Белаусаў* і актэт балалаек “Віцебскія віртуозы” (кіраўнік заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь *Т. Шафранава*), у другім – ансамбль танца, песні і музыкі “Талака” (кіраўнік *М. Падаляк*).

14 кастрычніка ў г. п. Лёзна ўрачыста адкрыта першая чарга культурна-аздараўленчага цэнтра.

Витебские вести. – 2016. – 18 окт. – С. 1.

29–30 кастрычніка ў Палацы культуры ААТ “БелАЗ” г. Мінска

адбыўся XV Рэспубліканскі конкурс маладых эстрадных выканаўцаў “Белазаўскі акорд”. Гран-пры конкурсу заваявала *Вольга Булай* (г. Новалукомль), “Прыз глядацкіх сімпатый – *Анастасія Лейкіна* (г. Віцебск)

http://dkbelaz.by/belakkord/index.php?ent=3

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

10 верасня ў пяты раз Віцебскі абласны краязнаўчы музей правёў абласное **свята-конкурс мастацкага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва для людзей з абмежаванымі магчымасцямі “Сонечны свет для ўсіх”**. На свяце прысутнічалі больш за 200 чалавек з 25 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва раёнаў Віцебскай вобласці і г. Віцебска і 7 абласных таварыстваў інвалідаў. На выстаўцы былі прадстаўленыя 382 творчыя работы 143 аўтараў, у тым ліку 23 калектыўныя (графіка і жывапіс, керамічная скульптура, мяккая цацка, кераміка, квілінг, вышыўка, вязанне, качанне з воўны, пляценне з паперы, вырабы з прыроднага матэрыялу, бісеру, саломкі, тканіны, стужак). Свята прадоўжылася ў КЗ “Віцебск”, дзе адбылася ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў і канцэрт. У музеі-сядзібе І.Я. Рэпіна “Здраўнёва” ўдзельнікаў свята чакалі экскурсіі па музеі, майстар-класы па маляванні і інш.

http://ratusha-vit.by/uslugi/prazdnik-konkurs-solnechnyy-mir-dlya-vseh

17–18 верасня на Міёршчыне прайшоў **экалагічны фестываль “Журавы і журавіны Міёрскага краю”**. У час свята адбылася інтэрактыўная прэзентацыя аграэкасядзіб і фота- і відэавыставы “Подых Ельні”, міёрскія красуні змагаліся за тытул “Журавінка Міёрскага краю”, Міёрская ЦБС ладзіла выставу экалагічнай літаратуры, шоу-праграма “Міёрская журавінка” радавала гасцей фестывалю спевамі і танцамі.

http://bel.sputnik.by/interesting/20160921/1025306524.html

8 кастрычніка ў г. Сянно адбыўся **фестываль-кірмаш працаўнікоў сяла Віцебскай вобласці “Дажынкі-2016”**. Падчас

хіміка-тэхналагічны каледж” (*цэнтральная раённая бібліятэка імя Ф. Скарыны*).

18 кастрычніка Падарожжа па жыцці і творчасці педагога і самадзейнай спявачкі *Алены Якаўлеўны Ясюкевіч* (*бібліятэка імя Я. Купалы*).

30 кастрычніка Сустрэча з членамі народнага літаратурнага аб'яднання “Каўчэг” “Строки, возвышающие душу” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Сенненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

15 верасня Дзень бібліятэк “Праздник для тех, кто любит книгу” (*цэнтральная раённая і дзіцячая бібліятэкі*) на цэнтральнай плошчы г. Сянно (выстаўка “Книжное рандеву”, тэатралізаванае прадстаўленне “Волшебное путешествие с книгой”, літаратурна-музычнае асарці “Будем с книгой мы дружить”, танцавальны флешмоб і інш.).

15 верасня супрацоўнікі *Машканскай* і *Багданаўскай сельскіх бібліятэк* запрасілі чытачоў на “Библиотечные сумерки”, *Алексініцкая сельская бібліятэка-клуб* правяла свята “Славный День библиотек”, *Багушэўская гарпасялковая* і *Ульянавіцкая сельская бібліятэкі* – Дзень адчыненых дзвярэй.

15 верасня Свята-ўшанаванне “Славим возраст золотой” у в. Заслонаўка з удзелам народнага фальклорнага калектыву “Вясёлыя музыкі” (*супрацоўнікі бібліёбуса ЦРБ*).

14 кастрычніка Літаратурна-музычны вечар “Імя табе – Жанчына” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Пастаўская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

18 кастрычніка на базе *Парыжскай сельскай бібліятэкі* адбыўся семінар бібліятэчных работнікаў раёна “Любительские объединения в библиотеке – территория увлечений”.

подано!”, агляд кніг беларускіх выдавецтваў “Кнігі сучаснай Беларусі”, “Чайная алхімія” ад народнага клуба “Флора”) (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

19 верасня Літаратурны вечар-сустрэча з мясцовай паэтэсай *Т. Селязнёвай* “Душа из тонких нитей” (*Адаменская сельская бібліятэка*).

25 верасня Рэспект-сустрэча з мясцовымі паэткамі *Т.А. Седневай* і *В.У. Пячонавай* “У вашых творах – ваша сэрца” (*Барсееўская сельская бібліятэка*).

16 кастрычніка Літаратурна-музычны калейдаскоп “Сузор'е паэтычнага слова”, прысвечаны паэтам Віцебшчыны – юбілярам 2016 года (*Барсееўская сельская бібліятэка*).

27 кастрычніка Урачыстае адкрыццё кафедры праваслаўнай літаратуры пры *Лёзненскай ЦРБ*. У мерапрыемстве прынялі ўдзел кіраўнікі раёна, калегі з абласной бібліятэкі і Руднянскай ЦБС (Расійская Федэрацыя), свяшчэннік Свята-Успенскага кафедральнага сабора г. Смаленска (Расійская Федэрацыя) протаіерэй *Міхаіл Гаравы*, благачынны Дзямідаўскай акругі Смаленскай вобласці протаіерэй *Аляксандр Міронаў*, сакратар Віцебскай епархіі протаіерэй *Уладзімір Разановіч*, благачынны Лёзненскай акругі *Вячаслаў Пашкевіч* і іншыя прадстаўнікі духавенства, жыхары г. п. Лёзна.

ДУК “Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

2 кастрычніка Вячоркі “Для тых, хто гады не лічыць” (*Шпакоўшчынская сельская бібліятэка-клуб*).

7 кастрычніка Мерапрыемства з цыкла “Аз і Букі беларускай культуры” – “Восеньскі святочны букет” (*дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога*).

12 кастрычніка Прававая кансультацыя “Пожилым забота, внимание и льгота” ў ДУ “Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Полацкага раёна” (*бібліятэка-філіял № 8*)

18 кастрычніка Экалагічная гадзіна “Разумны саюз з прыродай. Птушка года – гогаль звычайны” для навучэнцаў УА “Полацкі дзяржаўны

фестывалю прайшоў шэраг відовішчных мерапрыемстваў, у якіх прынялі ўдзел творчыя калектывы і майстры народнай творчасці вобласці, госці: святочнае шэсце ўдзельнікаў свята, тэатралізаванае прадстаўленне “Вытокі сімвалаў дзяржавы”, горад майстроў, канцэрт “Мая зямля – мая Радзіма” і інш. У канцэртных праграмах кірмашу прынялі ўдзел ансамбль народнай музыкі “Ватага” і “Бабкіны ўнукі” з г. Бранска (Расійская Федэрацыя).

ВАМЦНТ

У Полацку **23 кастрычніка** стартаваў **XXI Міжнародны фестываль арганнай музыкі “Званы Сафіі”**. У канцэртнай зале да **27 лістапада** выступяць лепшыя артысты з Літвы, Польшчы, Расіі, Японіі і вядучыя беларускія калектывы. Беларусь прадставіла музычная капэла “Сонорус” і *В. Шчупак* (арган), *К. Пагарэлая* (арган) і Дзяржаўны Камерны аркестр Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам *Я. Бушкова*, *Я. Віданаў* (флейта).

http://www.belta.by/culture/view/japonskaja-muzyka-prozvuchit-na-festivale-zvany-safii-v-polotske-213387-2016/

Канцэрты **XXX гарадскога фестывалю-свята аўтарскай песні “Віцебскі лістапад”** прайшлі з **28** па **30 кастрычніка**. У гэтым годзе ўдзельнікам адборачнага тура далі магчымасць атрымаць кансультацыю прафесійнага паэта, кампазітара, рэжысёра ці выканаўцы ў арт-майстэрні “Заварка”. З удзельнікамі знаёміліся аўтары, кампазітары і выканаўцы, сярод якіх музычны кіраўнік праекта – аўтар-выканаўца *Уладзімір Цвікі*, паэт, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры літаратуры ВДУ імя П.М. Машэрава, член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Расіі *Алена Крыклівец* і іншыя майстры. Сярод удзельнікаў канцэртаў прадстаўнікі Польшчы, Чэхіі, Расіі, Украіны і Беларусі. Упершыню ў рамках фестывалю-свята прэзентавалі выставу-інсталяцыю “Рытмы і рыфмы часу”. Экспазіцыя была сфарміравана з вершаваных твораў і работ мастакоў віцебскай школы розных пакаленняў (*Аляксандра Салаўёва*, *Аляксандра Мемуса*, *Ірыны Магучай*, *Аляксандра Пушкіна*, *Андрэя Духоўнікава* і іншых). Уладальнікам Гран-пры конкурсу аўтарскай песні стаў *Анатолій Папейка* (г. Магілёў).

http://www.gck.by/2016/10/11072

29 кастрычніка ў г. Лепелі на базе дзіцячай школы мастацтваў адбылося першае **абласное свята-конкурс аматарскіх дзіцячых тэатральных калектываў, прысвечанае Году культуры**. У свяце-конкурсе прынялі ўдзел 14 тэатральных калектываў – тэатры, студыі, гурткі з розных куткоў Віцебшчыны, якія прадставілі свае пастаноўкі ў дзвюх намінацыях – "Драматычны спектакль" і "Малыя тэатральныя формы". Па выніках конкурсу пераможцамі ў намінацыі "Малыя тэатральныя формы" сталі: студыя сцэнічнага мастацтва "Арт-праект" Цэнтра культуры "Віцебск" (лаўрэат I ступені), дзіцячы тэатр мініяцюр "Міні-мімы" Браслаўскага раённага цэнтра культуры (лаўрэат II ступені), дзіцячы аматарскі тэатральны калектыў Башнёўскага сельскага клуба Шумілінскага раёна (лаўрэат II ступені) і ўзорны юнацкі тэатр-студыя "Гармонія" Полацкага гарадскога Палаца культуры (лаўрэат III ступені). Лепшымі драматычнымі спектаклямі прызнаны пастаноўкі: дзіцячага тэатра "Форум" ДШМ г. Гарадка і ўзорнага тэатральнага калектыву "Сюрпрыз" Лепельскай ДШМ (лаўрэаты I ступені), узорны тэатр "Вясёлка" Палаца культуры г. Барань Аршанскага раёна (лаўрэат II ступені). Акрамя таго, некаторыя спектаклі былі адзначаны спецыяльнымі дыпломамі: за "лепшае ўвасабленне твораў нацыянальнай беларускай драматургіі", "лепшае музычнае афармленне", "лепшы акцёрскі ансамбль" і г.д. Пачынаючыя акцёры атрымалі ўзнагароды за лепшае выкананне галоўных роляў і роляў другога плана. Сярод творчых калектываў – удзельнікаў свята і гледачоў прайшоў конкурс на лепшую назву дадзенага мерапрыемства. Сярод прапаноў, прадстаўленых у розных фарматах і стылях (паштоўка, запрашэнне, афіша і г.д.), арганізатары і журы вылучылі назву – "Малая сцэна". Менавіта пад гэтай назвай дадзенае свята-конкурс адбудзецца ў наступны раз.

ВАМЦНТ

30 кастрычніка ў Віцебску адбыўся **IV міжнародны фестываль-конкурс "На легендарнай сцэне"** ў рамках міжнароднага праекта "Салют Талентаў". На сцэне філармоніі выступілі 250 удзельнікаў з 21 горада

рэдакцыі раённай газеты "Дняпроўская праўда").

15 верасня Акцыя-віншаванне "Бібліятэчны серпанцін" (*дзіцячая бібліятэка*).

15 верасня Бенефіс чытача "Чытанне – свята душы" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

1 кастрычніка Акцыя-віншаванне "Цеплынёй сагрэты вашы гады" (*сельская бібліятэка аграгарадка Асінторф*).

26 кастрычніка Гутарка-кансультацыя для чытачоў старэйшага школьнага ўзросту "Самое главное слово – семья" (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

18–19 кастрычніка Ранішнік для дзяцей малодшага школьнага ўзросту "Как во тереме во книжном" (*дзіцячая бібліятэка*).

ДУК "Лепельская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"

11 верасня ў *цэнтральнай раённай бібліятэцы* адбыліся наступныя мерапрыемствы: агляд-дыялог "Каларытнае і трапнае беларускае слова", гадзіна інфармацыі "Вершины человеческой мудрости", гадзіна паэзіі з праглядам відэароліка "Дзіўны край! Ён быццам для паэтаў!" і інш.

30 верасня Літаратурныя арэлі да 85-годдзя Н. Гілевіча "Не баюся, што мой век не вечны" (*Баброўская сельская бібліятэка-музей Я. Мароза*).

14 кастрычніка Літаратурная гасціная "За любовь, за ласку и заботу благодарны, мамочка, тебе!" (*Поплаўская сельская бібліятэка*);

23 кастрычніка Гульня-падарожжа "Кніжны экспрэс" па кнізе М. Лынькова "Міколка-паравоз" (*Каменская сельская бібліятэка-музей Т. Кляшторнага*).

ДУК "Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма"

15 верасня Акцыя "Ноч у бібліятэцы-2016" (прэм'ера новай кнігі *Л.В. Пахолкінай* "От рассвета до заката", прэзентацыя кніжных навінак "Читать

ДУК “Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і сетка публічных бібліятэк”

15 верасня Дзень адчыненых дзвярэй “Есть храм у книг – библиотека” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

27 верасня Гадзіна паэзіі “Моя душа настроена на осень”, прысвечаная творчасці паэтэсы Л. Рубальскай (*Прудніцкая сельская бібліятэка*).

4 кастрычніка Літаратурна-музычны вечар “Как молоды мы были” да Дня пажылых людзей (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

7 кастрычніка Семінар бібліятэчных работнікаў раёна “Роля бібліятэкі ў арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання людзей пажылога ўзросту” (*цэнтральная раённая бібліятэка*). Паказальнае мерапрыемства “Бабушки умеют все” (*Верамееўская сельская бібліятэка сумесна з СДК*).

15 кастрычніка Літаратурна-музычны вечар да Дня маці “Самае дарагое, самае блізкае”, прысвечаны Дню маці (*Бычыхінская сельская бібліятэка*).

ДУК “Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

1 кастрычніка сустрэча да Міжнароднага дня сталых людзей “Пусть осень жизни будет золотой” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

16 кастрычніка Святочная сустрэча да Дня маці “Пакроў нябесны над намі” (*дзіцячая бібліятэка*).

23 кастрычніка Фальклорная гадзіна “Сустрэча ля самавара” (*Прудніцкая сельская бібліятэка*).

30 кастрычніка Урок-спадчына “Запрашаем у сялянскую хатку” (*Станіслаўская сельская бібліятэка-клуб*).

ДУК “Дубровенская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

13 верасня Праскураўскія чытанні “Шчодры талент зямлі Дубровенскай” (*цэнтральная раённая бібліятэка сумесна з супрацоўнікамі*

Расійскай Федэрацыі, Украіны і Беларусі. Удзельнікі прадэманстравалі разнастайныя інструментальныя, вакальныя, харэаграфічныя, тэатральныя і цыркавыя нумары.

http://www.gorod212.by/news/1412066

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў **верасні** адбыўся круглы стол, прымеркаваны 950-годдзю першай беларускай бібліятэкі – бібліятэкі Полацкага сафійскага сабора. У мерапрыемстве бралі ўдзел кіраўнікі і прадстаўнікі Міністэрства культуры Беларусі, Беларускай Праваслаўнай Царквы, работнікі музеяў і бібліятэк. Удзельнікі мерапрыемства абмеркавалі пытанні захавання нацыянальнай кніжнай спадчыны.

Полацкі веснік. – 2016. – 20 верас. – С. 1.

ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”

6 верасня адкрылася інтэрактыўная выстаўка “Экамысленне: вучымся ў прыроды”. Арганізатары праекта – Інстытут імя Гётэ ў Мінску, ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна”.

8 верасня адбыліся літаратурныя чытанні з нямецкай пісьменніцай *Ганнай Кушнаровай*, арганізаваныя Інстытутам імя Гётэ ў Мінску сумесна з Нямецкай чытальнай залай Віцебскай абласной бібліятэкі.

13 верасня прайшлі першыя заняткі бясплатных курсаў “Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада”. Курсы арганізаваны Віцебскай абласной бібліятэкай, кафедрай гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава сумесна з клубам гістарычнай рэканструкцыі “Vargentorn” і Віцебскім гарадскім парталам.

15 верасня ў бібліятэцы адбыліся святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню бібліятэк Беларусі. У фае бібліятэкі адбылася традыцыйная выстава-панарама новых паступленняў кніг у фонд аддзела абанемента і МБА “Калі ласка ў свет кнігі!”, на працягу дня гучалі

класічныя мелодыі ў выкананні народнага ансамбля “Кантраст” Дзіцячай школы мастацтваў № 4, ансамбля скрыпачоў і саліста *Я. Байдака* (саксафон) ДШМ імя А. Багатырова. На пляцоўцы каля цэнтральнага ўвахода ў бібліятэку прайшлі прэзентацыі перыядычных выданняў з фонду бібліятэкі і выданняў з фонду сектара замежнай літаратуры. Усе жадаючыя мелі магчымасць наведаць кніжна-ілюстратыўныя выставы, прыняць удзел у бібліятэчных акцыях і віктарыне “Віцебск і кіно”. У бібліятэцы адбылося адкрыццё фотавыставы “Белорусские актеры в российском кино, российские актеры в белорусском кино” з удзелам калег са Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта і прэзентацыя бібліятэчнай выставы “Кніга ажывае ў кадры” з артэфактамі, прадастаўленымі УП “Кінавідэапракат”. У аддзеле літаратуры па мастацтве прайшла творчая сустрэча з галоўным рэдактарам часопіса “На экранах” *Л. Перагудавай* і пісьменнікам, кінадраматургам *Ю. Ляшко* (г. Мінск), адбылася сустрэча “Ад святла рампы да святла экрана” з акцёрамі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа, якія выканалі ролі ў кіно – *Г. Букацінай* і *Т. Скварцовай*. Для школьнікаў супрацоўнікі аддзела дзіцячай літаратуры правялі тэатралізаваны літаратурны ўрок “З кніжных старонак на экран: Вялікі і магутны Хатабыч” і мультпадарожжа “Па старонках любімых кніг”. У гэты дзень адкрылася выстаўка дзіцячага малюнка “Кніга дорыць мару” навучэнцаў студыі выяўленчай творчасці “Сузор'е” Віцебскага гарадскога цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, прайшла прэзентацыя бібліятэчнага праекта “Разам!” (для чытачоў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі). У Нямецкай чытальнай зале адбыліся мерапрыемствы для школьнікаў, якія вывучаюць нямецкую мову, супрацоўнікамі былі праведзены экскурсіі па бібліятэцы на нямецкай мове, прайшла прэзентацыя інтэрактыўнай выставы “Экамысленне: вучымся ў прыроды”, арганізаванай сумесна з Інстытутам імя Гётэ ў Мінску, адбылося адкрыццё выставы калажаў мастака *А. Крошкіна* ў рамках праекта “Новае жыццё старых кніг”. У аддзеле краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі прайшла прэзентацыя кнігі

“Наддзвінне” *Г. Загурскай*, *М. Балдоўскім*, *П. Буганавым* і іх сябрам *Д. Маскаленка*), фотавыстава “Роднага горада рысы”, квест “Верхнедзвінск: город старый, город новый”, экспрэс-віктарыны і інш. (*цэнтральная раённая бібліятэка*). Супрацоўнікі *дзіцячай бібліятэкі* праводзілі мерапрыемствы на вулічнай пляцоўцы пад назвай “Аллея читающего детства”.

ДУК “Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

3 верасня *Мазалаўская сельская бібліятэка* прадставіла на раённым свяце **“**Мазалаўскі карагод гульняў і гульбішчаў” кніжную выстаўку “Зберагчы, каб не страціць”.

15 верасня ў *цэнтральнай раённай бібліятэцы* адбылося рэкламна-іміджавае мерапрыемства, прысвечанае Дню бібліятэк “Есть храм у книг – библиотека”. У праграме: прома-акцыя “Запросім прахожых у бібліятэку”, акцыя “Рэкламны лістапад”, букросінг “Добрыя кнігі ў добрыя рукі” і інш.

19 кастрычніка Творчы вечар віцебскай паэтэсы *Галіны Сіняковай* “Я люблю сваю старонку” з удзелам аўтара-выканаўцы *Уладзіміра Кісткіна* (*Тулаўская сельская бібліятэка*).

22 кастрычніка супрацоўнікі *цэнтральнай раённай бібліятэкі* прынялі ўдзел у раённым свяце “Дажынкі-2016” (банер “Гісторыя Суража ў беларускім алфавіце”, квест-гульня “Знайдзі адказ у алфавіце”, літаратурны марафон “Шануйце роднае слова”, прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча)

27 кастрычніка Семінар бібліятэчных работнікаў раёна “Бібліятэка як фактар зберажэння культуры”. У праграме семінара: сустрэча з членам Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі паэткай *Аленай Федзяевай*, прэзентацыя творчага праекта “У вянок паэту” (пераклады вершаў М. Багдановіча ў выкананні аўтара – *Наталлі Салаўёвай*), медыяагляд “Праектная дзейнасць бібліятэк як спосаб рэалізацыі творчых ідэй” і інш.

г. Варонежа (Расійская Федэрацыя) (*дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака*).

ДУК “Аршанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

15 верасня Свята кнігі і чытання “Не секрет для всех вокруг – книга самый лучший друг” (*бібліятэка імя М. Горкага*).

15 верасня Паэтычная гадзіна “Паэт народны – паэт сапраўдны” да 80-годдзя з дня нараджэння Н. Гілевіча (*Задроўеўская сельская бібліятэка*).

ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Браслаўскага раёна”

У Год культуры Браслаў далучыўся да міжнароднага руху “Свабодная бібліятэка”. Побач з *цэнтральнай раённай бібліятэкай* адкрылася міні-бібліятэка пад адкрытым небам.

http://vitvesti.by/kultura/biblioteka-pod-otkrytym-nebom-braslave.html

10–16 кастрычніка Тыдзень добрых зносін “Любовью материнской мир прекрасен” (акцыя “Скажы добрыя словы маці”, бібліяграфічны агляд “Маці, імя тваё я нясу праз гады як святыню” і інш.) (*Ахрэмаўская сельская бібліятэка*).

20 кастрычніка Семінар-практыкум для бібліятэкараў раёна “Сучасныя падыходы ў рэалізацыі рэкламнай палітыкі бібліятэк” (*цэнтральная раённая бібліятэка*).

ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма Верхнядзвінскага раёна”

14 і **26 верасня** супрацоўнікі *цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Т. Хадкевіча* правялі сэмплінг-акцыю “Бібліятэка прапануе” для работнікаў цэнтральнай раённай бальніцы і льнозавода (знаёмства з рэкламнай прадукцыяй і гісторыяй бібліятэкі, агляд часопісаў беларускіх выдавецтваў, агляд твораў пісьменніцы, лаўрэата Нобелеўскай прэміі (2015, С. Алексіевіч).

15 верасня Свята “Бібліятэка – субяседнік, сябра” (сустрэча з членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі, народнага літаратурнага аб’яднання

магістранта кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава *А. Бараноўскага* “Яны нарадзіліся на Сенненшчыне” і прэзентацыя зборніка “Віцебскі край”, выдадзенага па выніках Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 170-годдзю з дня нараджэння М.Я. Нікіфароўскага. У аддзеле “Публічны цэнтр прававой інфармацыі” быў праведзены Дзень першакурсніка для студэнтаў 1-га курса юрыдычнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава, на якім выступіў намеснік пракурора Віцебскага раёна *П. Дамашэўскі*. Больш за 500 экскурсантаў, навучэнцаў і студэнтаў устаноў адукацыі г. Віцебска, азнаёміліся з гісторыяй Віцебскай абласной бібліятэкі, яе структурнымі падраздзяленнямі, інфармацыйнымі рэсурсамі і паслугамі.

13 кастрычніка адбыўся чарговы занятак бясплатных курсаў “Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада” на тэму “Віцебск – горад на шляху з вараг у грэкі”.

25 кастрычніка ў аддзеле перыядычных выданняў адкрылася выстаўка дэкаратыўна-прыкладной творчасці інвалідаў па зроку “Усе фарбы свету я бачу сэрцам”.

27 кастрычніка на курсах “Віцебск: рэальная і папулярная гісторыя роднага горада” адбыўся занятак на тэму “Віцебск ад язычніцтва да хрысціянства (рэлігійнае жыццё ў V–XIII стст.)”.

ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Віцебска”

7 верасня Творчая вечарына “На сцяжынках радзімых” члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэата абласных літаратурных прэмій імя У. Караткевіча і імя П. Броўкі *Вольгі Русілкі (бібліятэка імя Я. Маўра).*

15 верасня Сацыяльна-культурная акцыя “Бібліяноч-2016” (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*). У праграме шмат цікавых сустрэч, выстаў, акцый, майстар-класаў: “Для душы…” – выстава фларыстыкі *Людмілы* і *Анатоля Швед*, выступленне “Тэатра моды” з калекцыямі гістарычных касцюмаў “Таямніцы спадчыны” і “Віцебск”, тэатральны праект дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў

“Маяковский. Мысли”, у праекце “Кнігі майго жыцця” – сустрэча з мастацтвазнаўцай *Людмілай Хмяльніцкай*, зарад станоўчых эмоцый прысутным падарылі выступленні вакальных груп “Забава” ДУ “Палац культуры г. п. Руба”, “Каўчэг” (мастацкі кіраўнік *А. Іваноў*), барда *Пятра Захарава* і вакальнай студыі “Крэда” ДУА “Віцебскі гарадскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі”, (мастацкі кіраўнік *Я. Волкаў*). “Віцебская школа спартыўнага УШУ” правяла майстар-клас “Вогненны вецер”. Для аматараў паэтычнага слова працавала літаратурнае кафэ “Пад абажурам”, у кнігасховішчы прымала наведвальнікаў “Бібліятэчная акадэмія здароўя”.

27 верасня Сустрэча чытачоў з амерыканскім гісторыкам, пісьменніцай, дацэнтам універсітэта Вашынгтона ў Сент-Луісе (ЗША) *Анікай Вальке*, прэзентацыя кнігі “Пионеры и партизаны: устная история нацистского геноцида в Беларуси” (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*).

28 верасня Духоўна-асветніцкая акцыя “Здаровая сям’я – здаровая нацыя”, удзельнікамі якой сталі студэнты біялагічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава. У мерапрыемстве прыняла ўдзел каардынатар напрамку абароны мацярынства і сямейных каштоўнасцяў Віцебскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы, кіраўнік цэнтра “Умиление” *Іна Уладзіміраўна Касцюковіч*, якая прэзентавала лекцыйна-выставачны комплекс “Чалавечы патэнцыял Беларусі” (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*).

29 верасня адкрылася экспазіцыя работ членаў клуба мастакоў-аматараў “Контур” “Осенняя пора, очей очарованье...” (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*).

13 кастрычніка Паэтычная вечарына “Свет прыгожы мацярынскай любоўю” для чытачоў і членаў клуба “Трэці ўзрост” (*бібліятэка імя Я. Купалы*). У мерапрыемстве прынялі ўдзел паэт *Л. Мацюхін*, навучэнцы ДШМ № 2

17–19 кастрычніка Пазнавальная гадзіна “Народныя рамёствы

роднага краю” ў межах сумеснага праекта “У культуры краіны – душа народа” для выхаванцаў старэйшых груп ДУА “Дашкольны цэнтр развіцця дзіцяці №1” (*бібліятэка імя Я. Маўра*).

21 кастрычніка Літаратурна-музычная імпрэза “Ці прарасце маё слова-насенне?”, прымеркаваная да 20-годдзя з моманту выхаду першага зборніка паэткі *Вольгі Русілкі* “Табе” (*бібліятэка імя У. Караткевіча*).

21 кастрычніка Літаратурная вечарына “Загадкавы паэт сярэбранага веку”, прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння М. Гумілёва (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя М. Горкага*).

27 кастрычніка Свята паэзіі (*дзіцячая бібліятэка імя С. Маршака*), у рамках акцыі па ініцыятыве ДБУК “Варонежская абласная дзіцячая бібліятэка” “Міжнародны дзень паэзіі Маршака ў дзіцячых бібліятэках”.

ДУК “Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка”

6 кастрычніка ў рамках праекта “Дотянуться до звезд Новополоцка” прайшла творчая сустрэча з навучэнцам III курса Наваполацкага дзяржаўнага музычнага каледжа *У. Вінсковічам* (*цэнтральная гарадская бібліятэка імя У. Маякоўскага*).

7 кастрычніка Сустрэча ў рамках літаратурнага праекта “С авторской книгой – в гости к читателям” з членамі народнага калектыву “Крылы” паэткамі *Людмілай Мяхедка* і *Ларысай Сакарэнка* (*бібліятэка імя А.С. Пушкіна*).

12 кастрычніка ў рамках праекта “Чытай са мной па-беларуску” маладыя бібліятэкары сістэмы наведалі дзіцячую паліклініку.

21 кастрычніка Круіз да беларускай байкі “Пералівы роднай мовы” для вучняў старэйшых класаў СШ № 4 з удзелам паэтэсы *Раісы Цітовай* (паэтычнае аб’яднанне “Літаратурны каўчэг”) (*бібліятэка імя Я. Коласа*).

21 кастрычніка Анлайн-сустрэча “Мой город, моя библиотека” вучняў 5 “Б” класа СШ № 4 г. Наваполацка з пяцікласнікамі СШ № 72